*ТАЦЦЯНА РОШЧЫНА (Мінск)*

# ПРАБЛЕМЫ СТВАРЭННЯ І РЭАЛІЗАЦЫІ ПРАГРАМЫ «ПАМЯЦЬ БЕЛАРУСІ» ЯК НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ЧАСТКІ ПРАГРАМЫ ЮНЕСКА «ПАМЯЦЬ СВЕТУ»

Праграма ЮНЕСКА «Памяць свету», ажыццяўленне якой пачалося ў 1992 г., заснавана на аб’яднанні намаганняў сусветнай грамадскасці. Мэты Праграмы – стварэнне новых падыходаў да абароны дакументальнай спадчыны, дэмакратызацыя доступу да яе, забеспячэнне больш шырокага усведамлення значнасці гэтай спадчыны і неабходнасці яе захавання. Асноўныя задачы Праграмы – абарона рукапісных, друкаваных, аўдыёвізуальных і іншых дакументальных фондаў, якія знаходзяцца пад пагрозай страты, пашырэнне ўзаемнай інфармацыі дзяржаў-удзельнікаў Праграмы аб іх дакументальнай спадчыне і палягчэнне доступу да яе; забеспячэнне лепшых умоў захавання, кансервацыі і бяспекі.

На падставе Праграмы «Памяць свету» ў многіх краінах ужо распрацаваны і дзейнічаюць адпаведныя Нацыянальныя праграмы – «Памяць Амерыкі», «Памяць Аўстраліі» і інш. З 1995 г. у Расійскай дзяржаўнай бібліятэцы рэалізуецца праект «Памяць Расіі».

Адна з асноўных мэтаў і кірункаў падобных праграм – перавод на электронныя носьбіты рукапісных і друкаваных кніжных помнікаў. Электронныя тэхналогіі дазваляюць стварыць і ўзнавіць дакладныя копіі помнікаў, стварыць электронныя калекцыі і электронныя версіі на *CD-Rom*, *DVD*, прадстаўляць электронныя копіі ў Інтэрнеце. Яны дазваляюць аб’яднаць у адзіную калекцыю копіі кніжных помнікаў, арыгіналы якіх захоўваюцца ў шматлікіх замежных сховішчах. Гэта асабліва важна для Беларусі, таму што яна, як, напэўна, ніводная іншая краіна, страціла шмат са сваёй гістарычнай спадчыны. І больш за ўсё пацярпела самая безабаронная яе частка – менавіта дакументальныя, кніжныя помнікі.

Выкарыстанне электронных тэхналогій дазваляе вырашыць дзве асноўныя супрацьлеглыя задачы: забеспячэнне захаванасці рарытэтаў і іх даступнасці шляхам стварэння і выдачы копіі, забеспячэнне доступу да іх на адлегласці. Стварэнне і тыражыраванне электронных копій рукапісных і друкаваных дакументаў будзе забяспечваць і ахоўныя, і навуковыя, і вучэбныя, і асветніцкія задачы.

Выратаванне дакументальных помнікаў, што знаходзяцца ў бібліятэках, архівах, музеях, захаванне сваёй нацыянальнай памяці з'яўляецца найважнейшай задачай, якая стаіць перад беларускай культурай. У бібліятэках, архівах, музеях і іншых установах Беларусі захоўваюцца надзвычай багатыя фонды рукапісных матэрыялаў і друкаваных выданняў – нацыянальна-культурная спадчына складае сотні тысяч рукапісных і друкаваных кніг, архіўных дакументаў. Створаныя чалавечай думкай розных часоў і народаў, на многіх мовах, у розных галінах ведаў, гэтыя фонды ў сукупнасці ўтвараюць адзіны нацыянальны фонд дакументальных помнікаў, які з'яўляецца нацыянальным здабыткам, дакументальнай памяццю грамадства, найкаштоўнейшай гістарычнай крыніцай і выклікаюць цікавасць не толькі ў беларускіх даследчыкаў, але і ў шматлікіх замежных спецыялістаў. Толькі ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі захоўваецца каля 70 тыс. рукапісаў, старадрукаў, рэдкіх выданняў, якія датуюцца самая ранняе з XIV ст., больш за паўмільёна адзінак налічвае фонд нацыянальнага дакумента.

Помнікам нацыянальнай культуры з'яўляецца ўвесь 8-і мільённы фонд НББ. Значнымі па памеру і складу з'яўляюцца фонды Цэнтральнай навуковай бібліятэкі НАН Беларусі, асобных абласных бібліятэк і бібліятэк ВНУ. Каштоўнымі фондамі дакументальных помнікаў валодаюць Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі, Нацыянальны мастацкі музей Беларусі, Гродзенскі гісторыка-археалагічны музей, Полацкі музей гісторыі беларускага кнігадрукавання, Веткаўскі музей народнай творчасці і інш. Велізарныя калекцыі гістарычных дакументаў захоўваюцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі і іншых архіўных установах (на сённяшні дзень нацыянальны архіўны фонд налічвае 11 216 532 адзінак захавання), але гістарычна склалася так, што значная частка дакументальнай спадчыны Беларусі разышлася па свеце, знаходзіцца ў шматлікіх бібліятэках, архівах, музеях замежжа або дагэтуль яшчэ не выяўлена.

Пытанне аб стварэнні нацыянальнай праграмы «Памяць Беларусі» даволі доўга прапрацоўвалася і ў нашай краіне. У адпаведнасці з пратаколам даручэнняў прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь 2004 г. Міністэрствам культуры краіны было прынята рашэнне аб распрацоўцы Дзяржаўнай праграмы «Памяць Беларусі». На сярэдзіну 2005 г. дапрацоўваецца яе канцэпцыя, створана і працуе міжведамасная рабочая група са спецыялістаў розных кірункаў для дэталёвай распрацоўкі яе асобных частак.

У канцэпцыі праграмы вызначана прававая база, дадзены асноўныя панятці і азначэнні, паказаны ўзаемасувязі і ўзаемадзеянне з іншымі праграмамі. Плануецца, што яна будзе ажыццяўляцца на нацыянальным, рэгіянальным, лакальным і ведамасным узроўнях.

У Праграме будуць удзельнічаць Нацыянальная бібліятэка Беларусі (каардынатар праекта), Цэнтральная навуковая бібліятэка НАН Беларусі, абласныя бібліятэкі, бібліятэкі ВНУ, Нацыянальны музей гісторыі і культуры

Беларусі, Нацыянальнаы мастацкі музей Беларусі, Гродзенскі гісторыка-археалагічны музей, Полацкі музей гісторыі беларускага кнігадрукавання, Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі і іншыя архіўныя ўстановы, бібліятэкі, архівы, музеі замежжа, якія захоўваюць дакументальную спадчыну Беларусі.

Праграмай прадугледжваецца распрацоўка прававой і нарматыўнай базы па захаванню дакументальных помнікаў, забеспячэнне дзяржаўнага ўліку і фізічнага захавання дакументальнай спадчыны. Адной з галоўных яе частак з'яўляецца фарміраванне інфармацыйнай базы праграмы і базавых рэсурсаў з рэпрэзентатыўна прадстаўленай найкаштоўнейшай часткі дакументальнай спадчыны Беларусі.

Плануецца, што бібліятэкамі, архівамі, музеямі Беларусі ва ўзаемадзеянні з установамі замежных краін – Літвы, Польшчы, Расіі, Украіны і інш., дзе захоўваецца беларуская дакументальная спадчына, будуць выконвацца шматлікія падпраграмы і праекты. І як вынік – стварэнне банка дадзеных, своеасаблівай электроннай бібліятэкі «Памяць Беларусі». У першую чаргу яна будзе ўключаць перанесеную на электронныя носьбіты дакументальную спадчыну Беларусі, што дасць магчымасць стварыць калекцыю электронных копій нацыянальных дакументальных помнікаў, незалежна ад месца іх захавання і сусветных дакументальных помнікаў, што захоўваюцца ў Беларусі. Для гэтага будзе распрацавана праграма прыярытэтаў пераводу дакументальных помнікаў у электронную форму, алічбаваны калекцыі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, калекцыі іншых бібліятэк, музеяў, архіваў.

Ужо вядзецца работа над праектам *«Radziviliana»* з удзелам устаноў культуры Беларусі: пры падтрымцы ЮНЕСКА ствараецца пілотны (прэзентацыйны) *CD-Rom* «Нясвіж – культурны цэнтр Еўропы і нацыянальны помнік». Гэта толькі першы этап, за якім магчыма стварэнне мегапраекта з удзелам краін, у якіх знаходзяцца радзівілаўскія дакументы. Мэта праекта – выяўленне радзівілаўскай культурнай спадчыны ў сховішчах краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, уключэнне яго ў спіс ЮНЕСКА, бібліяграфічная рэканструкцыя кнігазбору Радзівілаў і стварэнне зводнай БД, на аснове якой плануецца і выданне друкаванага варыянта каталогу, стварэнне электроннай бібліятэкі паўнатэкставых копій і мультымедыйных *CD-Rom*, на якіх будуць прадстаўлены найбольш цікавыя і каштоўныя выданні са знакамітай калекцыі. Плануецца, што з імі можна будзе азнаёміцца і на асобным сайце ці партале ў Інтэрнеце. У гэтай рабоце маглі б удзельнічаць спецыялісты з бібліятэк Расіі, у якіх яшчэ захоўваюцца часткі радзівілаўскага кнігазбору, а з польскага боку – пытанні па стварэнню БД *«Radziviliana»* не аднойчы абмяркоўваліся на пасяджэннях двухбаковай Беларуска-польскай кансультацыйнай камісіі па культурнай спадчыне.

Па той жа схеме – бібліяграфічная рэканструкцыя кнігазбору, стварэнне электронных копій найбольш каштоўных дакументаў і г.д. – магла б весціся рэалізацыя праекту «Шчорсаўская бібліятэка Храптовічаў» з удзелам

Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і Нацыянальнай бібліятэкі імя У. Вярнадскага НАН Украіны.

Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі падпісаны дагавор аб рэалізацыі праекта «Скарбы славянскай культуры», сумесна з Расійскай дзяржаўнай бібліятэкай (стварэнне электронных копій расійскіх і беларускіх выданняў, якія цікавяць абодва бакі).

Плануецца распрацоўка праекта «Вяртанне» па выяўленню беларускай дакументальнай спадчыны ў замежных сховішчах, стварэнні іх электронных копій для забеспячэння доступу да іх (сумесна з канкрэтнымі установамі). У межах праграмы магчыма распрацоўка асобных праектаў па стварэнню электронных копій унікальных дакументальных помнікаў нацыянальнай культуры, што захоўваюцца ў дзяржаўных і недзяржаўных установах, цэрквах розных канфесій і інш. Так пачалася рэалізацыя сумеснага праекта Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і Інстытута мовазнаўства НАН Беларусі па даследаванню і выпуску *CD-Rom*, які будзе ўтрымліваць электронную копію рукапісу Слуцкага Евангелля 1582 г., што захоўваецца ў беларускм экзархаце, апісанне і каментарыі да яго. Рэалізуецца і другі аналагічны праект, які датычыць рукапісу на старабеларускай мове канца XV– пачатку XVI ст. «Арыстоцелевы вароты, або Тайная тайных», з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

У праграме «Памяць Беларусі» прадугледжана таксама арганізацыя сістэмы інфармацыі аб дакументальных помніках:

– будзе працягнута работа па стварэнню поўнай нацыянальнай рэтраспектыўнай бібліяграфіі «Кніга Беларусі», стварэнню БД нацыянальных дакументаў (у тым ліку выдадзеных па-за межамі краіны, «Беларусікі»); стварэнню бягучых і рэтраспектыўных каталогаў нацыянальных дакументаў на электронных і папяровых носьбітах;

– плануецца стварэнне нацыянальных баз дакладных запісаў імёнаў асоб, радавых імёнаў, геаграфічных назваў.

Адзіны банк даных дакументальных помнікаў краіны ўсіх узроўняў будзе ўключаць бібліяграфічныя апісанні помнікаў у складзе разгрупаваных па краіне фондаў. Апісанне плануецца зрабіць па адзінай методыцы, у сумяшчальных фарматах, што павінна забяспечыць пошук па адзінай інфармацыйнай сетцы.

Працягнецца работа над бібліяграфічнай праграмай «Кніжныя скарбы Беларусі» па стварэнню зводных каталогаў і каталогаў калекцый на электронных і папяровых носьбітах, нацыянальных кніжных помнікаў незалежна ад месца іх захавання і сусветных кніжных помнікаў, што захоўваюцца ў Беларусі

Сказанае ў асноўным датычыцца бібліятэк. Але адначасова свае, вялікія планы маюць музеі і архівы Беларусі, якія таксама захоўваюць дакументальную спадчыну.

Рэалізацыя праграмы павінна весціся на падставе мэтавага дзяржаўнага фінансавання, магчыма, з прыцягненнем дадатковых інвестыцый: можа быць выкарыстана фінансавая падтрымка з боку розных фондаў, фірм і іншых

спонсараў. Яна магчыма пры актыўнай падтрымцы дзяржаўных (рэспубліканскіх, абласных, раённых і мясцовых) органаў улады, грамадскіх і рэлігійных структур, кожнага зацікаўленага і неабыякавага да сваёй спадчыны чалавека.

Для дасягнення галоўнай мэты Праграмы – фізічнага захавання найбольш каштоўных дакументальных помнікаў з адначасовым стварэннем умоў доступу да іх любога зацікаўленага чытача – навукоўца, аматара, студэнта ці школьніка, – патрэбна шматгадовая, маштабная, інтэлектуальна і тэхнічна складаная праца. Пры гэтым выканаўцы будуць сутыкацца са шматлікімі праблемамі. Асноўныя з іх:

– значная частка дакументальнай спадчыны беларусаў захоўваецца па-за яе межамі – у бібліятэках, музеях, архівах Літвы, Польшчы, Расіі, Украіны, Германіі, Швецыі і іншых краін, многія матэрыялы яшчэ не знойдзены і не ідэнтыфікаваны;

– установы культуры маюць слабую матэрыяльна-тэхнічную базу, у сувязі з чым не вядзецца планамерная мэтанакіраваная работа па алічбоўцы, электроннаму капіраванню каштоўных фондаў, кансервацыі і рэстаўрацыі;

– не звяртаецца ўвага і, як вынік, не вырашаецца праблема захавання дакументаў другой паловы XIX – XX ст., напісаных ці надрукаваных на недаўгавечнай паперы, якая акісляецца і крышыцца. Гэтыя дакументы знаходзяцца на мяжы поўнага разбурэння. Неабходна ўлічваць, што працэс натуральнага старэння паперы дынамічны, пастаянна прагрэсіруе і можа прывесці да незваротных вынікаў – фізічнай гібелі часткі нацыянальнага культурнага здабытку краіны, напрыклад, Вялікага збору беларускай даваеннай перыёдыкі ў Хімках – філіяле Дзяржаўнай бібліятэкі Расіі.

У Беларусі вядзецца пэўная работа па захаванні дакументальных помнікаў. Але праблем шмат і складанасць іх такая, што вырашальныя яны толькі на міжведамаснай аснове ў межах шырокай нацыянальнай праграмы.

Распрацоўка, прыняцце і рэалізацыя доўгатэрміновай комплекснай Праграмы «Памяць Беларусі» на дзяржаўным узроўні вызначыць нацыянальную палітыку ў галіне захавання і прадастаўлення ў карыстанне дакументальнай спадчыны Рэспублікі Беларусь, дапаможа захаваць нацыянальную спадчыну.